**Бараноўскі Анатоль Васілевіч** // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. Мінск, 1996. Т. 2. С. 299.

**Барановский Анатолий Васильевич** // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 7 т.]. Минск, 2006. Т. 2. С. 199.

**Бараноўскі Анатоль Васілевіч** // Культура Беларусі : энцыклапедыя : [у 6 т.]. Мінск, 2010. Т. 1. С. 464.

**Бараноўскі Анатоль Васільевіч** // Беларускі саюз мастакоў : энцыкл. давед. / рэдкал.: Б. А. Крэпак (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск, 1998. С. 52.

**Каляда, А. А.** Бараноўскі Анатоль Васільевіч / А. А. Каляда // Выпускнікі Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў (1949–2004 гады) / А. А. Каляда ; Беларус. дзярж. акад. мастацтваў. Мінск, 2005. С. 40.

**Бараноўскі Анатоль** // Сучасны беларускі жывапіс. XXI стагоддзе [Выяўленчы матэрыял] = Современная белорусская живопись. XXI век = Modern Belarusian Painting. XXI century : альбом / [аўт. тэксту, склад., пер. на беларус. мову К. С. Аксёнава ; аўт. уступ. арт. Н. В. Шаранговіч ; пер. на англ. мову. С. В. Місюк]. Мінск, 2010. С. 30–33.

**Народны** мастак Беларусі Анатоль Бараноўскі: «Напаўненне душы – вось у чым праблема...» // Рэй : па матэрыялах публ. «Настаўніцкай газеты» / Мікола Чэмер. Мінск, 2015. С. 235–237.

**Борозна, М. Г.** Анатолий Васильевич Барановский (1937) / Михаил Борозна // Белорусская живопись 1920-1970 годов / Михаил Борозна ; Белорус. гос. акад. искусств. Минск, 2006. С. 174–177.

**Міхайлаў, В.** Срэбра родных туманаў / Віктар Міхайлаў // Беларусь. 2012. № 12. С. 34–39.

**Шаранговіч, Н.** Паэтыка першаснасці / Наталля Шаранговіч // Мастацтва. 2008. № 11. С. 15.

**Карамазаў, В.** Крынічыць срэбра : эсэ / Віктар Карамазаў // Роднае слова. 2008. № 7. С. 105–107.

**Шашалевіч, В.** У пошуках прыгажосці і гармоніі : уражанні ад пейзаж. жывапісу А. Бараноўскага / Вольга Шашалевіч // Беларусь. 2002. №. 7. С. 26–27.

## 27 мая – 80 гадоў з дня нараджэння (1937) В. Е. Лявончыкава, бібліяграфазнаўца, бібліятэказнаўца, педагога

Васіль Емяльянавіч Лявончыкаў, вядучы вучоны ў галіне бібліяграфазнаўства і бібліятэказнаўства, нарадзіўся ў в. Бярозаўка Слаўгарадскага раёна Магілёўскай вобласці. Пасля заканчэння Магілёўскага культурна-асветнага вучылішча імя Н. К. Крупскай працаваў інспектарам раённага аддзела культуры, дырэктарам дамоў культуры ў Чэрыкаўскім і Слаўгарадскім раёнах. Непрацяглы час загадваў бібліятэкай вайсковай часці ў Мінску. У 1962 г. В. Е. Лявончыкаў скончыў бібліятэчны факультэт Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага, у якім застаўся працаваць. Спачатку чытаў лекцыі па спецыяльных вучэбных дысцыплінах, потым выконваў абавязкі намесніка дэкана бібліятэчнага факультэта. У 1966–1968 гг. вучыўся ў аспірантуры Маскоўскага дзяржаўнага інстытута культуры, дзе пад кіраўніцтвам прафесара А. Д. Эйхенгольца ў 1969 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму «Общая ретроспективная библиография книг Белоруссии: история и теоретические вопросы», якая стала першым грунтоўным навуковым даследаваннем у галіне нацыянальнай рэтраспектыўнай бібліяграфіі. У 1971 г. В. Е. Лявончыкаў стаў дацэнтам кафедры бібліяграфіі, у гэтым жа годзе ўзначаліў бібліятэчны факультэт Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага. У 1975 г. адкрыўся Мінскі інстытут культуры (з 1993 г. Беларускі ўніверсітэт культуры, з 2004 г. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў (БДУКМ)), дзе В. Е. Лявончыкаў быў прызначаны дэканам бібліятэчнага факультэта (з'ўляўся ім да 1979 г.). У 1983 г. абраны прафесарам і ўзначаліў кафедру бібліяграфіі (з 2003 г. атрымала назву «Кафедра тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый»). На гэтай пасадзе знаходзіўся да 2009 г.

Творчы падыход да педагагічнай дзейнасці стаў характэрнай рысай вучонага як выкладчыка. Ён упершыню ў гісторыі вышэйшай бібліятэчнай адукацыі Беларусі распрацаваў і пачаў чытаць курс «Беларуская бібліяграфія», склаў і надрукаваў яго праграму і метадычныя матэрыялы. Прафесар В. Е. Лявончыкаў стаў заснавальнікам гэтай навуковай дысцыпліны. Ён грунтоўна вывучаў бібліяграфічныя працы акадэміка Я. Карскага, філолага і бібліёграфа Р. Зямкевіча. Аб'ектам даследавання вучонага былі вопісы бібліятэк Свята-Траецкага манастыра ў Слуцку



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

і Дабравешчанскага ў Супраслі; бібліяграфічныя матэрыялы ў прадмовах да выданняў беларускага першадрукара Ф. Скарыны, а таксама яго паслядоўнікаў; друкаваныя каталогі бібліятэк і кнігарняў XIX – пачатку XX ст. і інш. У 1983 г. выйшаў з друку падручнік «Белорусская библиография. Общий курс», у якім разглядаюцца тэарэтычныя асновы беларускай бібліяграфіі, яе гісторыя, арганізацыя і методыка. У 1991 г. быў выдадзены на беларускай мове.

У 1988 г. В. Е. Лявончыкаў абараніў у Маскве доктарскую дысертацыю на тэму «Система библиографической информации союзной республики: теоретико-методологические проблемы». Вынікі гэтага даследавання адлюстраваны ў манаграфіі «Система библиографической информации союзной республики: история, современное состояние, проблемы» (1990). Ён таксама аўтар манаграфіі «Беларуская рэтраспектыўная бібліяграфія кніг» (1971), першых у Беларусі прафесіянальных слоўнікаў «Русско-белорусский словарь библиотечных и библиографических терминов» (у суаўтарстве з Л. А. Дзямешка, 1992) і «Тлумачальны слоўнік бібліятэчных і бібліяграфічных тэрмінаў» (у суаўтарстве з Л. А. Дзямешка і Р. І. Саматыя, 2000), шматлікіх навуковых артыкулаў у замежным і айчынным друку. Адметнымі рысамі ўсіх работ з'яўляюцца грунтоўнасць метадалагічнай і фактаграфічнай асновы, дакладнасць даследчых мэт і сістэмы навуковай аргументацыі, тэарэтычная і практычная навізна і значнасць.

Выдатны навуковы патэнцыял В. Е. Лявончыкава ўвасобіўся ў заснаванай ім у 1994 г. навуковай школе «Бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства», прадстаўнікі якой працуюць у Беларусі і за межамі нашай краіны. Ён з'яўляўся таксама адным з арганізатараў аспірантуры ў БДУКМ, дзе выбіраўся старшынёй і намеснікам старшыні саветаў па абароне дысертацый на ступені кандыдатаў і дактароў навук. Сёння В. Я. Лявончыкаў выкладае на факультэце інфармацыйна-дакументных камунікацый БДУКМ. Лекцыі і семінары педагога выклікаюць цікавасць у студэнтаў, раскрываюць перад імі перспектывы навуковых пошукаў у бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці. У апошнія гады вывучае праблемы бібліятэчнай камунікацыі як стратэгічнага кірунку ўзаемадзеяння бібліятэкі і грамадства, ролі бібліятэк у сістэме бесперапыннай адукацыі.

Значнае месца ў жыцці В. Е. Лявончыкава займаюць грамадскія абавязкі. Ён з'яўляецца членам навукова-тэхнічнага савета БДУКМ і савета факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый, уваходзіць у рэдакцыйны савет часопіса «Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў», рэдкалегію зборніка «Здабыткі», які выдаецца Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі, і інш. Шмат гадоў В. Е. Лявончыкаў быў намеснікам і галоўным рэдактарам міжведамаснага зборніка «Вопросы библиографоведения и библиотековедения», з'яўляўся членам рэдкалегіі часопіса «Бібліятэчны свет», шэрагу іншых выданняў. Вучоны ўнёс вялікі ўклад у стварэнне Беларускай бібліятэчнай асацыяцыі, першым прэзідэнтам якой з'яўляўся на працягу 1992–1994 гг. (зараз ганаровы член). У 1993 г. быў абраны акадэмікам Міжнароднай акадэміі інфарматызацыі пры ААН (Масква), у 1996 г. членам-карэспандэнтам Беларускай акадэміі адукацыі. Яго імя ўключана ў слоўнік «2000 Outstanding Scientists of the 21st Century» («2000 выдающихся ученых 21-го века») (2005) Міжнароднага біяграфічнага цэнтра ў Кембрыджы, у даведнік «Кто есть кто на академическом Олимпе» (2004) Міжнароднай акадэміі інфарматызацыі пры ААН.

За навукова-педагагічную дзейнасць В. Е. Лявончыкаў узнагароджаны ордэнам СССР «Знак Пашаны» (1976), нагрудным знакам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь «За ўклад у развіццё культуры Беларусі» (2004), шматлікімі медалямі і ганаровымі граматамі.

*Працы В. Е. Лявончыкава*

**Беларуская** бібліяграфія : агул. курс : падруч. для студэнтаў ін-таў культуры па спец. 05.26. «Бібліятэказнаўства і бібліяграфія» / В. Е. Лявончыкаў. – Мінск : Вышэйшая школа, 1991. – 262 с.

**Белорусская** библиография : общ. курс : учеб. пособие для студентов спец. 2113 «Библиотековедение и библиография» / В. Е. Леончиков. – Минск : Вышэйшая школа, 1983. – 239 с.

**Система** библиографической информации союзной республики : история, соврем. состояние, проблемы / В. Е. Леончиков ; под ред. В. А. Фокеева. – Минск : Навука і тэхніка, 1990. – 252, [3] с.

**Беларуская** рэтраспектыўная бібліяграфія кніг / В. Е. Лявончыкаў. – Мінск : Вышэйшая школа, 1971. – 69, [2] с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Тлумачальны** слоўнік бібліятэчных і бібліяграфічных тэрмінаў / В. Е. Лявончыкаў, Л. А. Дзямешка, Р. І. Саматыя ; М-ва культуры Рэсп. Беларусь, УА «Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў». – 3-е выд., выпр. і дап. – Мінск : БДУКМ, 2012. – 231 с.

**Русско-белорусский** словарь библиотечных и библиографических терминов : [более 1500 терминов] / В. Е. Леончиков, Л. А. Демешко. – Минск : Вышэйшая школа, 1992. – 131, [2] с.

*Асобныя публікацыі*

**Информационная** деятельность библиотек в контексте концепции ЮНЕСКО «К обществам знания» / Леончиков В. Е. // Материалы II Международного конгресса «Библиотека как феномен культуры», Минск, 22–23 окт. 2014 г. / Нац б-ка Беларуси ; [сост. А. А. Суша ; науч. ред. Р. С. Мотульский]. Минск, 2014. С. 26–31.

**Публичная** библиотека в обществе знания: теоретический аспект / В. Е. Леончиков // Навуковы пошук у сферы сучаснай культуры і мастацтва : матэрыялы навук. канф. (Мінск, 28 лістап. 2013 г.) / М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; [рэдкал.: Ю. П. Бондар (старш.) і інш.]. Мінск, 2014. С. 250–255.

**Бібліятэчная** камунікацыя: тэрміналогія, асноўныя віды, вынікі / В. Е. Лявончыкаў // Беларуская культура ва ўмовах глабалізацыі : матэрыялы навук. канф., прысвеч. 35-годдзю БДУКМ (3 снеж. 2010 г.) : [у 2 т.] / М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; [рэдкал.: М. А. Мажэйка (старш.) і інш.]. Мінск, 2011. Т. 2. С. 114–119.

**Библиотека** в системе непрерывного образования / Леончиков В. Е. // Веснік Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. 2012. № 2. С. 122–129.

**Калекцыя** «Беларускі друк на Захадзе» Нью-Ёркскай публічнай бібліятэкі і яе адлюстраванне ў бібліяграфіі / Лявончыкаў В. Е. // Матэрыялы XII Міжнародных кнігазнаўчых чытанняў «Кніжная культура Беларусі: погляд праз стагоддзі», Мінск, 7–8 крас. 2016 г. / [склад.: Т. А. Сапега, А. А. Суша ; рэдкал.: Р. С. Матульскі (старш.) і інш.]. Мінск, 2016. С. 243–246.

**Кніжная** культура ў навуковых публікацыях акадэміка Я. Ф. Карскага / В. Е. Лявончыкаў // Духоўныя асновы сучаснай культуры: праблемы захавання культурнай спадчыны : XVI Міжнар. Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвеч. Дням славян. пісьменства і культуры (Мінск, 26–28 мая 2010 г.) : [у 2 т.] / М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; [рэдкал.: М. А. Мажэйка (старш.) і інш.]. Мінск, 2011. Т. 1. С. 143–146.

**Самостоятельная** работа студентов в условиях модернизации высшего библиотечного образования / В. Е. Леончиков // Бібліятэчная адукацыя: традыцыі і навацыі : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф. (23 кастр. 2014 г.) / М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, Фак. інфарм.-дак. камунікацый ; [рэдкал.: М. А. Яцэвіч (старш.) і інш.]. Мінск, 2015. С. 144–151.

**Информационно**-психологическая безопасность личности: библиотековедческий аспект / В. Е. Леончиков // Научные и технические библиотеки. 2008. № 12. С. 60–69.

*Аб жыцці і дзейнасці вучонага*

**Леончиков Василий Емельянович** // Республика Беларусь : энциклопедия : [в 7 т.]. Минск, 2007. Т. 4. С. 444.

**Леончиков Василий Емельянович** // Библиотечная энциклопедия. Москва, 2007. С. 568–569.

**Леончиков Василий Емельянович** // Кто есть Кто в Республике Беларусь, 2001 / [ред. совет: И. В.Чекалов (пред.) и др.]. Минск, 2001. Т. 1: Наука. Образование. С. 93.

**Лявончыкаў Васіль Емяльянавіч** // Памяць : Слаўгар. р-н : гіст.-дак. хронікі гарадоў і р-наў Беларусі / [рэдкал.: Г. І. Кісялёў і інш.]. Мінск, 1999. С. 512.

**Касап, В.** Лявончыкаву Васілю Емельянавічу – 75 / Вера Касап, Валянціна Саітава // Бібліятэчны свет. 2012. № 3. 3-я с. вокл.

**Касап, В. А.** Учёный, педагог, организатор подготовки библиотечных кадров / В. А. Касап, В. И. Саитова // Библиография. 2012. № 3. С. 125–128.

**Саітава, В.** Педагог, вучоны, бібліяграфазнавец / В. Саітава // Бібліятэчны свет. 2007. № 2. С. 31–32.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**Ореховская, И. В.** Библиотечные тайны / И. В. Ореховская. – Минск : БГУ, 2001. – 260, [2] с. : ил.
См. на с. 150–152.
**Васіль Емельянавіч Лявончыкаў** : [да 75-годдзя з дня нараджэння] : біябібліягр. паказ. / М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, Бібліятэка ; [склад.: Т. В. Ішуціна, Т. А. Самайлюк ; пад агул. рэд. Т. А. Самайлюк]. – Мінск : БДУКМ, 2012. – 70 с., [1] л. партр. – (Дзеячы навукі і культуры Беларусі).

## 28 мая – 90 гадоў з часу стварэння (1927) Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь

Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь з'яўляецца буйнейшым сховішчам дакументаў па гісторыі Беларусі XX ст. Гісторыя яго існавання пачалася ў 1927 г., калі Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР сваёй пастановай заканадаўча афармілі стварэнне ў Мінску Цэнтральнага архіва Кастрычніцкай рэвалюцыі БССР (ЦАКР БССР). Задачай новай установы з'яўлялася захаванне дакументаў дзяржаўных, грамадскіх, прафесійных і іншых арганізацый, што дзейнічалі ў Беларусі з лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. Фарміраванне фондаў архіва пачалося яшчэ ў 1922–1926 гг., калі ў архівасховішча пры Цэнтральным бюро Камуністычнай партыі БССР пачалі паступаць дакументы беларускіх нацыянальных, кааператыўных і прафсаюзных арганізацый, матэрыялы расфарміраваных воінскіх часцей і інш. Праводзілася разборка, падшыўка, інвентарызацыя дакументаў, якіх на 1 кастрычніка 1927 г. налічвалася больш за 161 тыс. Ужо ў першыя гады існавання ЦАКР БССР вызначыліся асноўныя напрамкі яго дзейнасці: камплектаванне, навукова-тэхнічная апрацоўка, улік, забеспячэнне захаванасці і выкарыстанне дакументаў. Пры архіве мелася навукова-даведачная бібліятэка, перададзеная яму Цэнтральным архіўным упраўленнем БССР, пачалі фарміравацца архіў кінафотадакументаў і сакрэтны архіў. У сувязі з памежным становішчам Мінска было прынята рашэнне аб пераводзе ўстановы ў Магілёў, што і было здзейснена ў 1930–1932 гг. Дакументы былі размешчаны ў былых будынках Магілёўскага Богаяўленскага манастыра і Станіславаўскага касцёла. У ліпені 1938 г. ЦАКР БССР быў рэарганізаваны ў Цэнтральны дзяржаўны архіў Кастрычніцкай рэвалюцыі і сацыялістычнага будаўніцтва БССР (ЦДАКР БССР). У даваенны час у архіве ў асноўным вялася праца па прыёме, размяшчэнні, апісанні, каталагізацыі архіўных фондаў. Пашыралася таксама і выкарыстанне дакументаў: яны выдаваліся даследчыкам, на іх аснове рыхтаваліся даведкі па запытах, у перыядычных выданнях краіны «Советская Белоруссия», «Рабочий», «Звязда» і іншых рабіліся тэматычныя публікацыі. У 1940 г. з друку выйшла кніга «Белоруссия в борьбе против польских захватчиков в 1919–1920 гг.», напісаная з выкарыстаннем матэрыялаў архіва. У сакавіку 1941 г. было прынята рашэнне аб стварэнні на базе фотааддзела ўстановы Цэнтральнага дзяржаўнага архіва кінафотафонадакументаў БССР, а таксама пераводзе ЦДАКР БССР у Мінск. Аднак гэтым планам перашкодзіла Вялікая Айчынная вайна. Раптоўны напад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і адсутнасць плана эвакуацыі не дазволілі вывезці дакументы архіва ў глыб краіны. Частка матэрыялаў згарэла, многія былі разрабаваны, перавезены ў іншыя памяшканні, знішчаны ў якасці макулатуры. У 1943 г. некаторыя дакументы па загадзе нямецкага кіраўніцтва адсартаваны і накіраваны ў Рыгу, дзе найбольш каштоўныя з іх рыхтавалі для далейшай адпраўкі ў Германію.

Аднаўленне працы архіўнай службы Беларусі пачалося з канца 1943 г., калі былі зацверджаны структура і штаты архіўных устаноў, у тым ліку і ЦДАКР БССР. Архіў узнавіў сваю работу ў студзені 1944 г. у Гомелі, а пасля вызвалення сталіцы пераехаў у Мінск. Амаль усё прыйшлося пачынаць спачатку: не хапала кадраў, не было патрэбных памяшканняў, абсталявання, мэблі і інш. За гады вайны загінулі большая частка дакументаў (захавалася ўсяго каля 80 тыс. спраў) і навукова-даведачны апарат да іх, амаль уся бібліятэка. У першыя пасляваенныя гады асноўнымі справамі сталі арганізацыя ўліку даваенных дакументаў, іх першапачатковая навукова-тэхнічная апрацоўка, вяртанне ў Мінск матэрыялаў з Магілёва і Рыгі. Таксама пачалі паступаць на захаванне фонды розных акупацыйных устаноў, ваенных фарміраванняў, беларускіх калабарацыйных структур, што дзейнічалі ў Беларусі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны. Адначасова супрацоўнікі ЦДАКР БССР выехалі ў Рыгу для арганізацыі вяртання дакументаў архіва ў Мінск, вялі іх пошук і збор у іншых архівах і ўстановах. Так былі знойдзены згубленыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ